

# Юрый Васільеў: «Твор мацуецца ідэяй»

АЛЕСЯ БЕЛЯВЕЦ

**Зменлівая і няпэўная рэч — майстэрня фатографа. З аднаго боку, да яе няблага стасуецца патэтыка, кшталту: «Майстэрня фатографа — гэта ўвесь свет!» Але ў той жа час ёю можа быць і студыя з расстаўленымі светлавымі прыборамі ды з камп'ютэрам у куце, і проста маленькі цёмны пакойчык з праявіцелямі, фіксатарамі і павелічальнікамі. Ёсць такі цёмны пакойчык і ў Юрыя Васільева. Але мы сабраліся, натуральна, не ў ім, а ў галерэі «Свет фота», сённяшнім яго працоўным памяшканні, дзе ён таксама мае справу з фатаграфіямі, толькі часцей — з чужымі. Месцаў, дзе ў нашым горадзе паказваюць фатаграфію, няшмат. І, як правіла, яны мала прыстасаваныя для гэтай функцыі. Галерэя «Свет фота» невялікая, але ў ёй цэлую сцяну займае ўнікальная калекцыя фотаапаратаў. Любая выстава глядзіцца тут няўлоўна далучанай да гісторыі. Таму і размова пачынаецца з гісторыі нашай фатаграфіі, яшчэ не напісанай.**



Горад. Фота. 1967.

**Алеся Белявец:** Юрый Сяргеевіч, вы — член фотаклуба «Мінск» з 1965 года, на працягу амаль 20 гадоў яго старшыня і мастацкі кіраўнік. Вы — адзін са стваральнікаў і арганізатараў праектаў «Выстаўкі фотаграфікі ў Мінску (1970-я–80-я гады)» і «Мінскі форум-98». Вы — аўтар і вядучы тэлеперадач «Фотапанарама» (1972–1977). Фактычна, больш за сорак гадоў развіцця гэтага мастацтва разгортвалася на вашых вачах. Але ад якой «кропкі» пачынае свой адлік беларуская фатаграфія?

**Юрый Васільеў:** З сярэдзіны XIX стагоддзя... Ужо ў 1850 годзе ў Мінску Антон Прушынскі адкрывае першую фотамайстэрню. Знакавая постаць — Ян Булгак, які паўплываў на ўсю фатаграфічную культуру гэтага краю.

**Алеся Белявец:** Мастацтва звычайна лагічна развіваецца, калі ёсць пераемнасць, калі кожнае новае пакаленне не «вынаходзіць веласіпед». Не думаю, што ўсе маладыя людзі, якія бяруць у рукі фотаапарат, ведаюць Булгака.

**Юрый Васільеў:** Могуць і не ведаць. Ды і мы не ведалі. Калі сталі шукаць пра яго матэрыял, то ні ў адной мінскай бібліятэцы нічога не знайшлі.

**Алеся Белявец:** Адкуль жа ўзяліся першыя звесткі?

**Юрый Васільеў:** Супрацоўніца бібліятэкі імя Леніна Тамара Зайцава знайшла папку з фатаграфіямі Булгака. Там было больш за два дзесяткі твораў, надрукаваных калі не самім майстрам, дык у яго майстэрні. Арыгінальныя здымкі ляжалі ў папачцы — і ніхто іх не кранаў.

**Алеся Белявец:** Ваша пакаленне піша сваю гісторыю, ведучы яе ад Булгака?

***У размове прымае ўдзел Дзяніс Раманюк — мастак, фатограф, выдавец.***

**Юрый Васільеў:** Безумоўна, гэты майстар вельмі моцна паўплываў. Тыя пікатарэалізм, карціннасць, якія Булгак заклаў у фатаграфію...

**Алеся Белявец:** Мяне крыху бянтэжаць гэтыя вызначэнні ў дачыненні да Булгака.

**Дзяніс Раманюк:** Шчыра кажучы, і мяне. Тое, як Булгак падае віленскую архітэктуру, — гэта чыста фатаграфічнае бачанне.

**Юрый Васільеў:** Але ў любым выпадку менавіта з яго пачалося панаванне пікатарэалізму ў стылістыцы аўтараў фотаклу-



Гаспадыня. Фота. 1985.

ба «Мінск». Выйсці з-пад гэтага ўплыву і сёння досыць цяжка. Нават маладое пакаленне ў гэтую плынь зацягваецца. Адзіным, каму ўдалося збочыць, быў Валерый Лабко. Ён і вучняў сваіх вывеў зусім на іншы кірунак.

**Алеся Белявец:** Як Лабко трапіў у фотаклуб?

**Юрый Васільеў:** У політэхнічным інстытуце быў факультэт грамадскіх прафесій, Аляксандр Сяргеевіч Дзітлаў там вёў фатаграфію, вучыў студэнтаў фотажурналістыцы. Ён захварэў і папрасіў мяне



Партрэт Міхаіла Жылінскага. Фота. 1985.

падмяніць яго. (Тады я, дарэчы, і пачаў весці «Фотапанараму» на Беларускім тэлебачанні.) Сярод студэнтаў вылучаўся адзін — Валерый Лабко. Пачаў задаваць пытанні: а хто такі Біндэ, а Суткус?.. Ніякім чынам я змог на іх адказаць. Пасля ён прынёс свае работы. І я адправіў яго ў фотаклуб «Мінск». Лабко з'явіўся ў нас у 1972 годзе, а з 1984-га пачалі дзейнічаць вучэбныя студыі. Першую вёў Міхась Жылінскі, а другую і трэцюю — Валерый. Ён вельмі грунтоўна падбіраў прэтэндэнтаў, яны запаўнялі вялікую анкету: хто любімы музыкант, кампазітар. Яму быў важны інтэлект чалавека, яго здольнасць развівацца. У клубе ж тады існавала разуменне, што фатаграфічнай тэхніцы можна навучыць за адзін месяц. Валерый быў выдатным настаўнікам, гэта ўсе адзначаюць, хто ў яго вучыўся. Ён мог наблізіць да сябе чалавека і адкрыць яго, даць яму магчымасць тварыць.

**Дзяніс Раманюк:** Такія ж педагагічныя прынцыпы ў Літоўскай акадэміі мастацтваў. Я гэта на сабе адчуў цягам навучання. Там студэнты не дрыжаць

ФОТА АНДРЭЯ СПРЫНЧАНА.

перад праглядамі, бо яны — калегі, яны зацікаўлены ў тым, каб набываць веды, каб знайсці сваю выяўленчую мову.
**Юрый Васільеў:** Валерый Лабко выпусціў, верагодна, каля 30 чалавек, але засталося ў творчасці няшмат...
**Алеся Белявец:** Засталіся зоркі, якія і стварылі з'яву «Мінскай школы фатаграфіі» — Шахлевіч, Маскалёва, Парфянок, Кажамякін і іншыя.
**Дзяніс Раманюк:** Дарэчы, чаму ты лічыш, што гісторыя фатаграфіі павінна грунтавацца на пераемнасці?
**Алеся Белявец:** Таму што новае пакаленне можа не ведаць, што зрабіла папярэдняе. І пачынаць свой шлях з нейкай абстрактнай кропкі...
**Юрый Васільеў:** Той жа Ігар Саўчанка ўзнік з ніадкуль. Калі ён паказаў свае работы, я адразу зразумеў, што гэта не наш, не фотаклубаўскі чалавек... Але ў гэты час ужо пачалі ствараццa аб'яднанні, Элізаровіч заснаваў «Панараму»...
**Дзяніс Раманюк:** Перыядычна ўзнікае пытанне наконт ненапісанай гісторыі беларускай фатаграфіі. Пра гэта не трэба гаварыць, трэба яе пісаць. Шкада, што няма чалавека, які б сабраў усё, што магчыма, і прааналізаваў.
**Юрый Васільеў:** Як толькі нехта робіць першы крок, яго пачынаюць дзяўбсці самі ж фатографы. Але ж пакуль няма чаго дзяліць. Зразумець агульнасць задач — вось што важна.
**Алеся Белявец:** Добра, пішам гісторыю далей. Што наступнае?
**Юрый Васільеў:** У 80-х сталі з'яўляцца паралельныя фотаклубу суполкі: «Панарама», «Вячэрні Мінск», «Правінцыя» (якая ўтварылася з Лабкоўскай школы). Назва апошняй — вельмі сімвалічная. Раз адбыўся прынцыповы адрыў ад фотаклуба, назва якому «Мінск», значыць альтэрнатыва яму — «Правінцыя». А мы ж чакалі гэтых новых людзей. І хацелі, каб яны прыйшлі...

Разрыў пакаленняў адбыўся не проста так: фотаклубаўцы не былі гатовы прыняць тое, што рабіла моладзь. Да таго ж змянілася палітычная сітуацыя, адкрыліся межы, і гэтая новая фатаграфія адразу выплюхнулася ў Еўропу. Фатографы пачалі шмат ездзіць і атрымліваць прафесійную мастацтвазнаўчую ацэнку сваёй творчасці. Чаго ў Беларусі не магло быць, бо тут толькі адзінкі займаюцца даследаваннем і аналізам фатаграфіі.

У 1989 годзе мы сталі рыхтавацца да ўстаноўчага з'езда Саюза фотамастакоў. Я тады быў старшынёй фотаклуба «Мінск» і таксама займаўся гэтым. Валерый Лабко, які быў адным з арганізатараў, хацеў стварыць элітарную суполку. Каб рабілася рэальная справа і не было лішніх людзей.

На з'ездзе за яго прагаласавалі, і ў 1990-м ён стаў старшынёй Саюза фотамастакоў. Але ніякай рэальнай падтрымкі не атрымаў, «крытычнай масы», якая б магла нешта зрушыць з месца, не мелася. Цешыла ілюзія, што сілы знойдуцца, калі з'явіцца ідэя. Грошай таксама не было, і першымі ад суполкі адвярнуліся фотажурналісты: яны разлічвалі на заказы, ільготы, майстэрні — як у Саюзе мастакоў.

А мы, старэйшае пакаленне, на гэтым устаноўчым з'ездзе не патрапілі ні ў якія структуры. Пераемнасці не адбылося. Дарэчы, за два гады існавання саюза ў яго быў прыняты толькі адзін чалавек. Потым Саюз фотамастакоў разваліўся.

Калі пачалася кампанія па стварэнні другога саюза, Лабко да гэтага ўжо дачынення не меў. Ён захапіўся камп'ютэрнымі праграмамі. А фотаклуб «Мінск» запрасілі спрычыніцца да арганізацыі новай суполкі фотамастакоў, шчыра пераконвалі, што ўлічаць старыя памылкі. Але дзейнасць саюза на спадзе, можна сказаць, што ён не жыве, а выжывае.
**Алеся Белявец:** Справа ў неразвітой інфраструктуры фатаграфічнага жыцця?
**Юрый Васільеў:** Патрэбна крытыка, мастацтвазнаўчы аналіз, каб фатаграфія як від творчасці развівалася.
**Алеся Белявец:** А навошта фатографам мастацтвазнаўчы аналіз? Навошта вызначаць прафесійныя крытэрыі? Рынку ж няма.
**Юрый Васільеў:** Рынак сам па сабе не паўстане. Павінны з'яўляцца прапановы, прычым узаемавыгадныя. Трэба пака-



**Лошыца. Фота. 2004.**



Браслаў. Млын (трыпціх). Фота. 2007.

заць, што ты хочаш прадаць, знайсці пакупніка, якога таксама трэба выхоўваць. І гледача. У Маскве атрымалася?
**Алеся Белявец:** Яшчэ як.
**Юрый Васільеў:** І там імгненна з'явіліся і попыт на фатаграфію, і фестывалі, і інфраструктура. У сярэдзіне 80-х мы былі не горшыя і мелі што паказаць. Тое, што рабілі лабкоўцы, мала хто разумеў. А бізнесоўцы, якія друкуюць кніжкі, выдаюць фотаальбомы, іхнюю творчасць і цяпер не разумеюць.
**Алеся Белявец:** Галерэя ў цэнтры горада вырашае пытанне?
**Юрый Васільеў:** Галерэя ў цэнтры горада дапаможа яго вырашыць. Зноў жа — хто будзе ёю кіраваць? Што паказваць?

Галерэі «Свет фота» ў верасні спаўняецца пяць гадоў. У летні час я ўжо не ведаю што паказваць. Такое ўражанне, што аўтары вычарпаліся.
**Дзяніс Раманюк:** Аўтары ёсць. Вінаваты «звярыны выскал капіталізму»: творцам не да выстаў, бо тыя патрабуюць грашовых укладанняў. Зрабіць выставу — гэта ўчынак. А потым прыйдзе чалавек дзесяць, напішуць тры радкі. І ўвесь вынік. Чаму я стаў рабіць кнігі? Бо кніга — гэта матэрыяльная рэалізацыя.
**Алеся Белявец:** Дзяніс, мы тут прасачылі пэўную траекторыю развіцця беларускай фатаграфіі. Дзе, з якой кропкі пачынаецца твая ўласная гісторыя?
**Дзяніс Раманюк:** З майго бацькі, з Міхася Раманюка. Ён не зрабіў адкрыцця ў фатаграфіі, для яго яна была інструментам даследчыцкай дзейнасці. Бацька здымаў этнаграфічныя рэчы, але рабіў гэта як мастак. Развіваўся асобна і не ўваходзіў у клуб.
**Юрый Васільеў:** Але Міхась Раманюк пастаянна прыходзіў на выставы, перажываў за фатаграфію. І заўсёды запрашаў аўтараў у часопіс «Мастацтва Беларусі», рэдактарам якога быў. І невыпадкова рубрыка там пазней з'явілася — «Мастацкае фота».
**Алеся Белявец:** Дзяніс, ты стаў здымаць, арыентуючыся на бацьку. Хто табе цікавы ў беларускай фатаграфіі? Ад чаго ты сам адштурхоўваўся, што прымаў?
**Дзяніс Раманюк:** Калі казаць пра мае віленскія серыі, у іх адчувальны след Булгака. Мне ўвогуле беларуская фатаграфія бліжэй, чым літоўская. Я часта чую ад літоўскіх калегаў, што фатаграфую не як літовец.
**Юрый Васільеў:** Фотамастацтва нашых суседзяў больш рэзкае, жорсткае. Невыпадкова з'явіліся цыклы «Людзі Літвы» Антанаса Суткуса, «Квітненне» Рамуальдаса Ракаўскаса, «Літоўскія вясковыя кірмашы» Аляксандра Мацыяўскаса. Апошні фатограф сёння кажа: «Мы думалі, што Савецкі Саюз ніколі не распадзецца, і хацелі зафіксаваць сваю нацыянальную самабытнасць». Гэта была ідэя, увасобленая ў творах. У нас яе не было, і твораў такіх не было. «Мы мусілі зафіксаваць, — казаў Мацыяўскас, — рэаліі той краіны». Яны зафіксавалі, і новае пакаленне ўжо магло рабіць іншую фатаграфію.

Цікава тое, што нашы суседзі сёння паставілі задачу вярнуць фотааматарства. Напрыклад, праводзяць міжнародны фестываль фотаклубаў (дарэчы, наш «Мінск» заняў там першае месца і мы запрошаны на выставу ў Вільнюскую галерэю), фестываль рэпартажнай фатаграфіі.
**Алеся Белявец:** Давайце вернемся ўсё ж да галерэі «Свет фота». На якіх прынцыпах грунтуецца яе дзейнасць?
**Юрый Васільеў:** Першы і галоўны: нельга зніжаць узровень выстаў. Наступны: паказваць розную фатаграфію, і не толькі мінскіх творцаў, старую фатаграфію і маладых аўтараў, таму што гэта ўжо наша будучая гісторыя. І сусветнае мастацтва, у тым ліку — суседзяў.
**Алеся Белявец:** На творчасць час застаецца?
**Юрый Васільеў:** Аўтар генерыруе новыя ідэі звычайна на працягу 8–10 гадоў. Калі гэты плённы перыяд заканчваецца, ідэі, якія яшчэ не знайшлі свайго ўвасаблення, могуць эксплуатавацца і далей, але аўтар ужо пачынае паўтараць сябе. Сёння я люблю фатаграфаваць разгорнутымі цыкламі: «Лошыца», «Браслаў»... З узростам пачынаю цаніць такую фатаграфію, пад якой можна паставіць дату і час. Эксперыменты адыходзяць на другі план...

Я не лічу сябе Аўтарам. Асноўная задача, якую я ставіў перад сабой, — прыўнесці культуру ў беларускую фатаграфію. Вы не ўяўляеце, як непераканальна, як няцэласна мы выглядалі ў 1960-я гады на фоне нашых суседзяў — Літвы, Польшчы, Расіі! Прыўнесці культуру — значыць вырашыць мноства арганізацыйных задач і праблем. А фатограф павінен шмат здымаць, удасканальвацца. Фатаграфія патрабуе ўсяго чалавека, нават больш, чым усяго, і толькі тады можа быць дасягнуты пэўны вынік. Я мог бы зрабіць нашмат болей.